**ПО́ЎНАЕ І ПУСТО́Е**, паняцці, якія знаходзяцца між сабою ў бінарнай апазіцыі і ў нар. уяўленнях маюць сімвалічны сэнс. Поўнае заўсёды асацыіравалася з багаццем, дастаткам, пустое — з беднасцю, галечай. Таму добрым знакам лічылася сустрэць у дарозе поўны воз дроў, чалавека з поўным абярэмкам сена. Асабліва вялікую ўдачу абяцала, калі хтосьці пераходзіў дарогу з поўным вядром вады. І наадварот, калі дарогаю сустрэнецца, ці тым больш пяройдзе яе чалавек з пустым вядром, верылі, што абавязкова не пашанцуе: у рыбака будуць пустыя сеткі; таму, хто едзе на ворыва ці з ворыва або на засеўкі, не пашчасціць з ураджаем (на полі будзе шмат пустых мясцін, прагалаў і інш.). Абавязкова не пустым вярталі чужы посуд, каб таму, у каго яго пазычалі, не было пуста: у збанок клалі хоць лусту хлеба, тады ў каровы не перавядзецца малако. Паняцці П. і п. нярэдка ўзнікалі і падчас сямейных абрадаў. Сустрэча кумоў, што вязуць хрысціць дзіця, з чалавекам, які нясе поўнае ці пустое вядро, абяцала нованароджанаму або шчаслівае жыццё, або блізкую смерць. На перадвясельным этапе— *запоінах*, калі адчувалася папярэдняя згода на шлюб, будучая нявеста вяртала сватам прывезеную імі і выпітую бутэльку не пустую, а ссыпала ў яе зярняты жыта, тым самым як бы жадаючы будучай радні дабрабыту. Перад выездам на шлюб поўнае вядро вады як сімвал плоднасці вылівалі каню пад ногі, а сустракалі з-пад вянца маладых таксама з поўнымі вёдрамі і з пажаданнямі, каб іх жыццё поўнілася шчасцем. Зробленая загадзя труна не павінна была ніколі заставацца пустою, каб не прыцягнуць да сябе дачасна нябожчыка, і таму яе ў такіх выпадках засыпалі жытам. Часта ў народзе паняцце поўнага (г. зн. багацця) звязвалася з адпаведнай квадраю Месяца — поўняю. Асабліва гэта датычылася розных пачынанняў (магія 1-га дня): менавіта на поўню стараліся запасваць скаціну (каб яна добра пладзілася), рабіць провідкі перад ворывам (тады і засекі будуць поўныя). Пустым днём, калі непажадана пачынаць справу (напрыклад, выходзіць на сяўбу), лічыўся панядзелак. І наадварот, худы, тоненькі сярпок месяца нібыта варожыць на беднасць. На П. і п. арыентаваліся дзяўчаты падчас каляднай варажбы, выцягваючы саломіны з новай страхі: калі трапляўся поўны колас — выйдзе замуж за багатага, калі пусты — за беднага. Тая ж сімволіка прысутнічала і пры тлумачэнні сноў: поўная пасудзіна, поўны воз прадказвалі радасць, даход, багацце, а пустая — смутак, убытак, беднасць. Пусты куфар у сне сведчыў пра набліжэнне чыесьці смерці ў доме.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996. С. 245, 248—249, 251, 256, 262, 443, 505—506, 509, 511; Тое ж. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 121, 123, 194, 215, 269, 431, 508; Тое ж. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 645.

*У. А. Васілевіч.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ